УДК 811.161.3’276.6.62

# Тэрміналагізацыя агульнаўжывальных слоў як крыніца фарміравання і папаўнення тэхнічнай тэрміналогіі (на матэрыяле групы слоў – назваў частак цела чалавека)

Гіруцкая Л.А., Сахончык А.П.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Пры вывучэнні прадугледжанай праграмай дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” тэмы “Беларуская навуковая тэрміналогія” разглядаюцца пытанні, звязаныя з гісторыяй фарміравання і развіцця беларускай навуковай тэрміналогіі, паходжаннем, спецыфікай і спосабамі ўтварэння тэрмінаў. Найбольшую зацікаўленасць студэнты праяўляюць да тэрмінаў, створаных шляхам ужывання агульналітаратурных слоў у тэрміналагічным значэнні.

Большая частка назваў частак цела чалавека мае індаеўрапейскае ці агульнаславянскае паходжанне і з’яўляецца адной з самых старажытных груп сучаснай беларускай агульнаўжывальнай частотнай лексікі.

У двухтомным “Русско-белорусском политехническом словаре” прадстаўлена немалая колькасць слоў-тэрмінаў і тэрміналагічных словазлучэнняў са словамі гэтай групы. Так, з апорным кампанентам *галоўка* ёсць 178 тэрмінаў, *цела* – 90, *зуб* – 61, *кулачок* – 46, *лапатка* – 37, *палец* – 35, *жыла* – 28, *калена* – 23, *плячо* – 21, *пята і пятка – па* 14, *губка* – 12, *шыйка* – 11, *ножка і ручка – па* 10, *зубы*– 9, *шчака* – 9, *вушка і нага* – па 6, *спінка* – і *кулак* – па 5 тэрмінаў. Маюцца і адзінкавыя ўтварэнні: *губа* фарматнай карэткі; *губы* гібачнага прэса; *лоб* барановы (геал.). Аналіз падобных тэрмінаў дазваляе студэнтам прыйсці да высновы аб узнікненні іх на аснове метафарычнага пераносу, заснаванага на рознага віду падабенстве.

Разгляд тэрмінаў з гэтай групай назоўнікаў у якасці апорнага кампанента прымушае звярнуць увагу на прысутнасць сярод іх слоў з памяншальна-ласкальным значэннем, якое абумоўлена наяўнасцю суфіксаў *-к-*, *-ок-* і цалкам страчана ў сувязі з адсутнасцю экспрэсіўнай афарбоўкі ў тэрмінаў. Адназначнасць і сістэмнасць тэрмінаў таксама могуць быць выяўлены навучэнцамі пры аналізе таго ці іншага тэрміналагічнага гнязда, асабліва пры наяўнасці сістэмы памет.

Праца над тэрміналагічным гняздом дазваляе выканаць і структурна-граматычную характарыстыку тэрмінаў, выдзеліць прадуктыўныя найменні розных структурных тыпаў і адносіны паміж іх кампанентамі: **галоўка** *алмазная, помпы, счытвання, валачыльнай цялежкі, свідравальнага станка перасовачная*.